ЛЮБАНШЧЫНА ПАРТЫЗАНСКАЯ

# Напярэдадні вызвалення: сакавік



Іван Фёдаравіч ЛЮБАНЧЫК.



Марыя Фёдараўна МАЛІНОЎСКАЯ (злева) і Кацярына Фёдараўна ШЫНКЕВІЧ (байцы п/бр. №258 імя В. Куйбышава).



План баявой аперацыі абмяркоўваюць Іосіф Аляксандравіч БЕЛЬСКІ, сакратар Мінскага абкама КП(б)Б, Васіль Іванавіч КАЗЛОЎ, камандзір Мінскага партызанскага злучэння, Пётр Іванавіч СМІРНОЎ, в.а. камандзіра п/бр. №64 імя В.П. Чкалава, Іпаліт Сільвестравіч КАНАНОВІЧ, камісар п/бр. №64 імя В.П. Чкалава, 1944 г.

**06.03.1944 партызанскія радысты атрымалі пастанову ЦК ВКП(Б) па правядзенні Міжнароднага жаночага дня.**

У свята на сходах у населеных пунктах ішла размова пра ролю жанчын у Вялікай Айчыннай вайне, пра іх работу ў савецкім тыле на фабрыках і заводах, у калгасах і саўгасах. А напярэдадні быў выдадзены спецыяльны нумар раённай газеты «Кліч Радзімы», у якім расказвалася пра жанчын – удзельніц партызанскага руху.

Трэба сказаць, на Любаншчыне іх было шмат. З першых дзён акупацыі нараўне з мужчынамі жанчыны ўключыліся ў падпольны рух. Яскравы прыклад таму – Феня Конанава, настаўніца Нежынскай школы, арганізатар камсамольска-маладзёжнага падполля ў Любанскім раёне. Разам са сваёй зямлячкай Пелагеяй Беразун яна стварыла падпольную групу ў в. Нежын. Феня Конанава загінула ў студзені 1942 г., Пелагею Беразун нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі летам гэтага ж года.

Рыгор Плышэўскі, камандзір партызанскага атрада імя А. Неўскага, у газеце «Кліч Радзімы» (№23 ад 29.10.1943 г.) пісаў пра байца свайго атрада Насцю Зуевіч з п. Сосны: «Дарагі баец, адважная дзяўчына, смела дзейнічае на чыгунцы і ў баі не падкачае». Так можна было сказаць і пра Алену Андруховіч з в. Касцюкі, байца гэтага ж атрада, Еўдакію Кудзелька з в. Кузьмічы (атрад імя Кутузава), Марфу Рассохіну з в. Камуна і Марыю Сушчэню з в. Пласток (атрад «Жалязняк»), Ганну Бацюк з в. Пласток (атрад імя Лазо), Еву Барысевіч з в. Рэдкавічы (атрад імя Громава), Ірыну Комар з в. Рачэнь (атрад «Камсамолец») і многіх іншых.

**Сярод кіраўніцтва партызанскіх атрадаў таксама былі жанчыны. Так, намеснікам камісара па камсамоле партызанскай брыгады №258 імя В. Куйбышава была прызначана Марыя Маліноўская.**

У склад Любанскага падпольнага райкама камсамола ўваходзілі Зінаіда Дуброва і Лідзія Валошчанка. А калі ў в. Загалле была адкрыта школа, байцы партызанскіх атрадаў Аляксандра Бедзік, Марыя Дзяшковіч, Аляксандра Комлік і Антаніна Радзько атрымалі загад стаць настаўніцамі гэтай школы.

Найбольш жанчын і дзяўчат працавала ў партызанскіх шпіталях медыцынскімі сёстрамі і санітаркамі, як Марыя Макуцэня і Валянціна Шаплыка, урачамі, як Фаіна Захарык, Любоў Зміровіч і Вольга Міхайлоўская, узначальвалі медыка-санітарную службу партызанскіх атрадаў і брыгад, як Кацярына Юрацкая і Вольга Высоцкая. Дзякуючы ім на тэрыторыі раёна не здарылася эпідэмій інфекцыйных захворванняў, у строй вярнуліся сотні параненых партызан.

Нягледзячы на складаную баявую абстаноўку ў прыфрантавым раёне, ва ўмовах падполля працягвалі выдаваць газеты, якія адыгрывалі вялікую ролю ў інфармаванні насельніцтва аб падзеях на фронце і баявой дзейнасці партызан. У сакавіку 1944 г. жыхары Любаншчыны атрымалі тры нумары раённай газеты «Кліч Радзімы» (750 экзэмпляраў) і тры лістоўкі (1 000 экз.). Асноўнай тэмай артыкулаў стала выкрыццё планаў нямецка-фашысцкіх акупацыйных улад па мабілізацыі беларускага насельніцтва ў Беларускую краявую абарону (БКА).

Газеты і лістоўкі заклікалі насельніцтва не паддавацца на правакацыі, не з'яўляцца на зборныя пункты і не аддаваць ворагу хлеб. Лістоўкі пісалі: «Партызаны і партызанкі! Дапамагайце насельніцтву пазбавіцца нямецкай мабілізацыі. Растлумачце ўсім, што аб'яўленая гітлераўцамі мабілізацыя – новы крывавы план фізічнага знішчэння беларускага народа. Абараніце наш народ, завіце народ, арганізуйце народ на барацьбу з нямецкімі захопнікамі. Знішчайце каманды, якія зганяюць народ на прызыўныя пункты, граміце прызыўныя пункты».

Партызаны дастаўлялі газеты і лістоўкі ў населеныя пункты Любанскага раёна, праводзілі з мясцовымі жыхарамі тлумачальную работу – толькі прапагандыстамі партызанскай брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі было зладжана да 200 сходаў на тэрыторыі 8 сельсаветаў. У мэтах зрыву мабілізацыі і абароны мірнага насельніцтва ад насільнага ўгону на прымусовыя работы ў Германію камандаванне партызанскай брыгады №101 імя А. Неўскага накіравала партызанскія атрады імя Д. Гуляева і імя І. Сталіна на нямецкія прызыўныя пункты ў вёскі. У выніку туды не з'явілася ніводнага чалавека.

**Нямецка-фашысцкае камандаванне стварыла спецыяльны атрад з 200 чалавек, які павінен быў правесці насільную мабілізацыю. Карнікі адкрылі сапраўднае паляванне на маладых мужчын і юнакоў.**

Яны ўрываліся ў вёскі, палілі дамы, хапалі людзей. Дакументы Нацыянальнага архіва РБ расказваюць пра падзеі сакавіка 1944 г. у вёсках Новыя і Старыя Дунцы, Рачэнь, Новая Дуброва (апошнюю карнікі спалілі 10 сакавіка). Былі знішчаны амаль поўнасцю вёскі Старасек і Татарка. У ходзе аблаў з населеных пунктаў Любаншчыны фашыстам удалося вывезці да 400 мужчын. Насільна сфарміраваныя атрады БКА выкарыстоўваліся на ахове розных складоў, на пагрузцы і адпраўцы ў Германію нарабаванай маёмасці і на іншых гаспадарчых работах. А калі нямецкае камандаванне выдала загад аб іх выкарыстанні ў баявых дзеяннях, пачаўся масавы пераход з батальёнаў БКА на бок партызан.

У сакавіку 1944 г. камандаванне нямецка-фашысцкіх войскаў імкнулася наладзіць работу камунікацый у сваіх армейскіх тылах. З гэтай мэтай было распачата аднаўленне разбураных партызанамі грунтовых і чыгуначных дарог. Асаблівую ўвагу вораг надаваў рамонту чыгункі ад ст. Урэчча праз в. Таль, г.п. Любань, саўгас «10 год БССР» да ст. Старушка. Партызаны не маглі дапусціць аднаўлення дзейнасці гэтай транспартнай артэрыі. 10.03.1944 камандаваннем партызанскай брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі быў выдадзены загад №72, які ставіў задачу па зрыве нямецка-фашысцкіх планаў.

Аперацыя па знішчэнні чыгуначнага палатна была прызначана на 11 сакавіка. Усе партызанскія атрады брыгады павінны былі выйсці на адведзеныя для іх участкі з неабходнымі для выканання задання інструментамі: чыгуначнымі ключамі і лапамі для разборкі рэльсаў, сякерамі і піламі для знішчэння шпал. Узрыўчатку для правядзення дадзенай аперацыі рэкамендавалася не выкарыстоўваць, яна магла спатрэбіцца для разбурэння дзеючых камунікацый праціўніка.

У 7 гадзін раніцы партызаны прыступілі да выканання баявой задачы. Пры дапамозе доўгіх бярвенняў або проста рукамі яны адрывалі рэльсы ад шпал, затым па 16-20 чалавек бралі рэльс, гнулі яго і ламалі. Услед за імі іншыя з сякерамі і піламі калолі і рэзалі шпалы, перакопвалі чыгуначны насып.

Вораг спрабаваў перашкодзіць партызанам, на чыгунку высылаліся групы, якія абстрэльвалі партызан. Але за тры дні народныя мсціўцы выканалі пастаўленую перад імі задачу: было разбурана 15 км чыгункі. Гэтым самым яны вывелі са строю лінію Старушка-Урэчча, па якой нямецка-фашысцкае камандаванне змагло аднавіць рух цягнікоў толькі ў чэрвені ў выніку праведзенай карнай аперацыі супраць партызан і мірнага насельніцтва.

Аляксандр Далідовіч, камандзір партызанскай брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі, у справаздачы аб палітмасавай рабоце і баявых дзеяннях паведамляе, што ў сакавіку атрадамі брыгады пушчана пад адхон 3 варожыя эшалоны на Палескай чыгунцы, у выніку чаго знішчаны 3 паравозы, 22 вагоны з боепрыпасамі і жывой сілай, 3 танкі і 5 аўтамабіляў. На дарозе Любань-калгас імя БВА на мінах падарвалася 10 грузавых аўтамабіляў з боепрыпасамі, прадуктамі харчавання і жывой сілай праціўніка, па дарозе Урэчча-Любань-калгас імя БВА знішчана 14 км тэлефоннага кабелю. Акрамя таго, за месяц у баях на тэрыторыі раёна партызаны брыгады ліквідавалі 36 варожых салдат і афіцэраў.

Панеслі страты і партызаны: у баях з акупантамі загінулі байцы брыгады №25 Аляксандр Бязручка, Сяргей Лучыновіч і Сцяпан Лучыновіч, Мацвей Гуткоўскі, Адам Рамановіч, Павел Гаўрыловіч, Фёдар Насановіч, Аляксандр Сярчэня.

На працягу сакавіка 1944 г. вялі баі з ворагам і партызанскія брыгады №64 імя В.П. Чкалава, №100 імя С.М. Кірава і №258 імя В.В. Куйбышава, якім удалося выйсці з кальца лютаўскай варожай блакады і заняць новыя рубяжы абароны. 24 сакавіка загінуў Аркадзь Бахановіч з атрада імя А. Труцікава брыгады №258. Ён з групай народных мсціўцаў перапраўляўся праз Арэсу на плыце і трапіў у варожую засаду. Фашысты пачалі расстрэльваць партызан на вадзе. Аркадзь даплыў да берага, але выратавацца не змог. Падчас перадыслакацыі загінулі Сямён Вяроўкін і Сцяпан Сушчыц з атрада імя Р. Катоўскага, **Іван Любанчык** з атрада «Жалязняк», Трафім Прыма з атрада імя Лазо (усе тры атрады належалі да брыгады №64), Сцяпан Брытвіч з брыгады №100.

29 сакавіка Любанскі падпольны райкам КП(б)Б прыняў пастанову, якой агучыў асноўную задачу «перад усімі камуністамі і камсамольцамі, партызанамі і насельніцтвам Любаншчыны ўзмацніць удары па адступаючых нямецка-фашысцкіх войсках і тым самым наблізіць час вызвалення беларускай зямлі ад захопнікаў»...

**Наталія СІНЯК, дырэктар Любанскага музея народнай славы.**